УДК [655.4+050](476)”1921/1939”

# ЛІТАРАТУРНЫЯ ЧАСОПІСЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: ГРАМАДСКАЕ ЗНАЧЭННЕ

***Надзея Слука***
*Мінск, Беларусь*

У артыкуле аналізуецца грамадскае значэнне літаратурных часопісаў у Заходняй Беларусі. Разглядаецца іх роля ў якасці сродка нацыянальнай кансалідацыі, пляцоўкі для палітычных дыскусій і для абнародавання вынікаў навуковых даследаванняў.

***Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, літаратурныя часопісы, міжваенны перыяд.***

Літаратурным часопісам з’яўляецца перыядычнае выданне, якое цалкам ці часткова прысвечана літаратуры; у такім часопісе могуць друкавацца як мастацкія літаратурныя творы (проза, паэзія, эсэ), так і крытычныя і даследчыя артыкулы, рэцэнзіі, кніжныя агляды, біяграфічныя даведкі, інтэрв’ю і лісты. Літаратурныя часопісы могуць мець агульны характар альбо прадстаўляць дакладную літаратурную плынь ці групоўку.

Першыя літаратурныя часопісы з’явіліся ўва Францыі ў XVII ст., аднак іх шырокае распаўсюджанне ў свеце адбылося ў XIX ст., калі сацыяльна-эканамічныя змены ў грамадстве прывялі да паступовага пашырэння пісьменнасці і адукацыі, а прамыслова-тэхнічны прагрэс зрабіў магчымым масавае выданне кніг і перыёдыкі [25, с. 231–243].

Полесгу

Мастацкая літаратура займала адно з найважнейшых месцаў у беларускім адраджэнскім руху пачатку ХХ ст., таму мастацкім творам адводзілася пачэснае месца на старонках першых беларускіх газет. Адзін са стваральнікаў газеты “Наша Ніва”, выдатны беларускі нацыянальны дзеяч Антон Луцкевіч так характаразваў важнасць мастацкай літаратуры: “…Наш культурны стан і ёсьць тая сіла, якая можа збудаваць вольную, ні ад каго не залежную Беларусь. Найлепшы паказчык культурнага стану народу, паказчык багацьця яго душы і творчае моцы – гэта яго літаратура” [13, с. 93].

Аднак непасрэдна літаратурныя часопісы ўпершыню былі выдададзены ўжо пасля рэвалюцый 1917 г.: у снежні 1919 г. выйшаў ілюстраваны часопіс “Беларускае жыцьцё” пад рэдакцыя Ф. Аляхновіча, а ў лютым 1920 г. – часопіс “Рунь”, які рэдагаваў Я. Купала.

Пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы і далучэння заходняй часткі беларускіх этнічных земляў да Польскай рэспублікі беларускамоўны перыядычны друк, як і ўсе іншыя бакі нацыянальна-культурная дзейнасці беларусаў, быў падзелены на савецкі і заходнебеларускі. Такое палажэнне захоўвалася да верасня 1939 г.

У Заходняй Беларусі нацыянальная дзейнасць беларусаў адбывалася ў неспрыяльных умовах крызіснага сацыяльна-эканомічнага становішча края і палітычнага ўціску з боку дзяржаўнай улады. Беларускі перыядычны друк пакутваў на слабое фінансаванне, абмежаваную чытацкую базу і частыя канфіскацыі. Таму, нягледзячы на важнасць літаратурных выданняў для развіцця нацыянальнай культуры, якую вельмі добра разумелі заходнебеларускія грамадскія дзеячы, за 20 год існавання Заходняй Беларусі была выпушчана нязначная колькасць літаратурных часопісаў, а перыяд іх выхаду пераважна не дасягаў і аднаго года.

Усяго ў Заходняй Беларусі выйшла восем менавіта літаратурных выданняў: “Родныя гоні”, “Беларуская Культура”, “Досьвіткі”, “Новая варта”, “Нёман”, “Літэратурная старонка”, “Крыгалом” і “Калосьсе”. Польскі даследчык Ежы Трачук у сваёй бібліяграфіі заходнебеларускай перыёдыкі таксама адносіць да літаратурных часопісаў зборнік “Заходняя Беларусь”, выдадзены Беларускім выдавецкім таварыствам у 1924 г. [26, с. 114]. Сапраўды, гэтае асветна-навуковае выданне было пераважна прысвечана беларускай літаратуры і яе гісторыі, аднак ва ўступным артыкуле выдаўцы зборніка дакладна абвясцілі яго неперыядычнасць, зазначыўшы, што наступная кніжка выйдзе, толькі ў тым выпадку, калі выдавецтва будзе мець дастаткова матэрыялу і фінансавую падтрымку з боку беларускага грамадства [10, с. 2].

У першай палове 1920-х гг. адбывалася паступовае павелічэнне кольскасці беларускамоўнай перыёдыкі ў Польшчы, у 1926 - 1927 гг. выходзіла ўсяго болей за 30 газет і часопісаў [26, с. 63]. Як і ў ранейшы час, літаратурныя творы і водгукі на іх стала друкаваліся амаль ва ўсіх перыядычных выданнях: у газетах, моладзевых і студэнцкіх часопісах, грамадскіх і навуковых выданнях, аднак літаратурныя часопісы ў гэты перыяд адсутнічалі. Часткова функцыю літаратурнага часопіса выконваў “Крывіч”, грамадска-культурны і навуковы часопіс, які выдавалі ў Коўна беларускія палітычныя дзеячы В. Ластоўскі і К. Дуж-Душэўскі. З тэрытарыяльнага пункту гледжання гэтае выданне не з’яўлялася заходнебеларускім, аднак культурна-асветная дзейнасць беларусаў Літвы, Латвіі і Чэхіі была цесна звязана з Заходняй Беларуссю. Пераважная большасць выдаўцоў беларускай перыёдыкі ў гэтых краінах падтрымлівалі сталыя сувязі з заходнебеларускім культурным асяродкам. Так, у часопісе “Прамень” рэдактары, беларускія студэнты ў Празе, пісалі, што іх выданне “хоць выдаецца на эміграцыі, у першую чаргу прызначаецца для Заходняе Беларусі” [5, с. 3]. “Крывіч” выходзіў у Коўне з 1923 г. па 1927 г., на яго старонках друкаваліся як тагачасныя беларускія мастацкія творы, так і пераклады замежных аўтараў, шмат увагі ў часопісе надавалася беларускай культурна-гістарычнай спадчыне. Аўтарам значнай колькасці як літаратурных, так і даследчых публікацыя з’яўляўся сам В. Ластоўскі.

Нарэшце ў сакавіку 1927 г. у Вільне выйшаў першы нумар літаратурнага часопіса “Родныя гоні”, у красавіку таго ж года – “Досьвіткі”, а ў ліпені таксама 1927 г. – першы нумар “Беларускай культуры”. Адначасовае з’ўленне адразу трох літаратурных

Полесгу

часопісаў на працягу аднаго года можна патлумачыць з аднаго боку актывізацыей нацыянальнага руху, да якога прывялі ўтварэнне і дзейнасць Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), а з другога боку – паглыбеннем палітычнага і ідэалагічнага расколу ў беларускім грамадстве.

Часопіс "Родныя гоні" выдаваўся Таварыствам беларускай школы (ТБШ) пры фінансавай падтрымцы Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі [9, с. 55]. Усяго з сакавіка па кастрычнік 1927 г. выйшла шэсць кніжак часопіса. Рэдактарам і выдаўцом першых чатырох кніжак была В. Дзегцяранка, апошніх двух – М. Станкевіч. Часопіс друкаваў творы заходнебеларускіх і савецкіх паэтаў і пісьменнікаў, даследаванні па беларускай літаратуры і гісторыі, асвятляў дзенасць ТБШ, вёў палеміку з іншымі заходнебеларускімі выданнямі (найчасцей – з газетай "Беларуская крыніца"). Шмат увагі ў часопісе навадалася барацьбе за нацыянальную школу ў Заходняй Беларусі, школьнай працы і метадам выхавання.

Часопіс "Досьвіткі" быў выдадзены таварыствам "Беларуская хатка", рэдактарам стаў А. Ганчарэнка. Нягледзячы на амбіцыйную мэту заняць месца агульнага заходнебеларускага часопіса літаратуры і мастацтва [3, с. 1] часопіс спыніў выхад пасле першага ж нумара. Часопіс меў часткова гумарыстычны характар: у ім былі размешчаны некалькі забаўляльных твораў, у тым ліку невялічкая п'еса Антона Васілеўскага, выдаўца сатырычна-гумарыстычнага часопіса "Авадзень".

"Беларуская культура" таксама праіснавала вельмі кароткі тэрмін – выйшла толькі тры нумары ў двух кніжках. Рэдактарам-выдаўцом стаў Ф. Умястоўскі, беларускі пісьменнік, які ўдзельнічаў у выданні першай беларускай легальнай газеты "Наша доля", а ў 1927–1928 гг. выдаваў паланафільскую газету "Беларускі дзень". "Беларускую культуру" вызначаў шырокі падбор літаратурных твораў: акрамя заходнебеларускіх паэтаў у часопісе былі прадстаўлены творы М. Горкага, А. Міцкевіча, Р. Ралана, Ю. Славацкага, Р. Тагора. Таксама часопіс падрабязна асвятляў культурнае жыццё Заходняй Беларусі.

Паступовае ўзмацненне палітычных рэпрэсій і нацыянальнага ўціску з боку дзяржаўных улад, а таксама пачаўшчыся ў 1929 г. сусветны эканамічны крызіс прывялі да таго, што з канца 1920-х гг. колькасць беларускамоўных выданняў пачала скарачацца. Новая спроба выдаваць літаратурны часопіс была зроблена ў 1931 г., калі студэнцкае аб'яднанне "Скарынія" выдала першую кніжку часопіса "Новая варта". З-за відавочных фінансавых цяжкасцяў, а таксама ідэйных непаразуменняў сярод саміх удзельнікаў аб'яднання выхад часопіса быў вельмі нерэгулярны: другая кніжка выйшла толькі ў 1932 г., а трэцяя (і апошняя) – увогуле ў 1934 г. Рэдактарам-выдаўцом першай і трэцяй кніжак быў Т. Грышкевіч, другой – К. Глінскі. Часопіс выдаваўся выключна лацінкай, што вылучала яго з іншых літаратурных часопісаў Заходняй Беларусі.

У студзене 1932 г. пачаў выходзіць яшчэ адзін літаратурна-мастацкі часопіс – "Нёман". Выдаўцом часопіса быў А. Будзька, заходнебеларускі паэт і публіцыст, які ў 1916 г. выдаваў у Петраградзе беларускамоўную газету "Светач", а рэдактарам – знакаміты мастак П. Сергіевіч; з чацвертай кніжкі рэдактарам стаў С. Станкевіч. Часопіс перастаў выходзіць пасля пятай кніжкі, праіснаваўшы меней года. Акрамя літаратурных твораў у "Нёмане" друкаваліся гістарычныя, мовазнаўчыя, мастацтвазнаўчыя даследаванні, хроніка культурных падзей у Заходняй Беларусі.

У студзене 1934 г. быў выдадзены першы нумар літаратурна-мастацкага часопіса "Літэратурная старонка". Яго ўзнікненне звязана з дзейнасцю рэдакцыі "Беларускай газеты", неафіцыйнага органа КПЗБ. У канцы 1933 г. па іх ініцыятыве адбылася канферэнцыя рэвалюцыйных пісьменнікаў Заходняй Беларусі, на якой было прынята рашэнне аб выданні "Літэратурнай старонкі" [9, с. 81]. Рэдактарам стаў Я. Патаповіч. Аднак першы нумар быў канфіскаваны ўладамі, выпуск часопіса забаронены. Паколькі выдаўцы ўсведамлялі магчымасць канфіскацыі, частка накладу была адразу схавана, і таму пазбегла знішчэння [9, с. 82].



ПолесГУ

Яшчэ адна спроба выдаць камуністычны літаратурны часопіс была зроблена ў лютым 1935 г., калі быў надрукаваны часопіс "Крыгалом". Рэдактарам яго стаў Ю. Кепель. Аднак і гэтае выданне было закрыта адразу пасля першага нумара.

У "Літэратурнай старонцы" і "Крыгаломе" былі прадстаўлены творы маладых заходнебеларускіх пісьменнікаў, далучыўшыхся да камуністычнага руху: Я. Чабора, М. Васілька, П. Граніта, А. Іверса, М. Танка, Ф. Грышкевіча.

Урэшце беларускае літаратурнае жыццё згуртавалася вакол самага буйнага літаратурнага часопіса Заходняй Беларусі – "Калосься". Часопіс пачаў выдавацца Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры (БІГіК) ў 1935 г. і да ліквадацыі інстытута ў 1936 г. з'яўляўся яго друкаваным органам. Рэдактарам-выдаўцом часопіса ўвесь час да спынення яго выхаду ў 1939 г. з'яўляўся Я. Шутовіч. Першапачаткова менавіта супрацоўнікі БІГіК адыгрывалі галоўную ролю ў часопісе: рэдакцыйная калегія складалася з А. Станкевіча, М. Пяцюкевіча, М. Шкялёнка і А. Бярозкі. Аднак з цягам часу супрацоўнікамі "Калосься" сталі таксама М. Васілёк, М. Танк, А. Іверс, П. Сергіевіч, М. Машара, С. Сахараў, Р. Шырма. У апошнія перадваенныя гады часопіс становіцца галоўнай трыбунай заходнебеларускай літаратуры, аб'яднаўшы беларускую творчую інтэлегенцыю ў крызісных умовах распаўсюджвання фашызму ў Еўропе.

Безумоўна, уплыў літаратурных часопісаў на беларускае грамадства Заходняй Беларусі быў даволі абмежаваным, што было абумоўлена сціплымі памерамі накладаў, кароткім часам існавання часопісаў, непісменнасцю і беднасцю значнай часткі насельніцтва. Аднак прысутнасць літаратурных выданняў у беларускамоўнай перыёдыцы вызначала важны крок у культурным будаўніцтве. Пытанні паўнавартаснасці беларускай культуры, у асаблівасці той яе часткі, якая стваралася па-за межамі БССР, няспынна турбавалі заходнебеларускіх грамадскіх і культурных дзеячоў. Выдаўцы часопіса "Калосьсе" адзначалі, што літаратура і мастацтва "з'яўляюцца ў Заходняй Беларусі ў стане прымітыўным, а нашая інтэлігенцыя корміцца ў значнай меры культурай чужой" [4, с. 1]. Выданне літаратурных часопісаў павінна было дапамагчы беларускай культуры знайсці і ўмацаваць сваё месца сярод іншых нацыянальных культур сусвету. Ставячы на мэту выхаванне новых беларускіх паэтаў і празаікаў, часопісы друкавалі пераклады замежных літаратурных твораў сусветнага ўзроўню, іх крытычныя разборы, а таксама водгукі і рэцэнзіі на беларускія літаратурныя творы замежных крытыкаў.

Яшчэ адным балючым пытаннем, якое стала прыступнічала ў грамадскіх дыскусіях міжваеннага часу, была праблема раз'яднанасці беларускай нацыі і яе культуры, і вынікаючае з гэтага аслабленне і збядненне яе культуры. Адным са спосабаў пераадолення гэтага штучнага падзелу адной нацыі на дзве часткі выдаўцы і рэдактары літаратурных часопісаў лічылі шырокае і ўсебаковае прадстаўленне тагачаснай беларускамоўнай літаратуры на старонках сваіх выданняў. Выдаўцы часопіса "Досьвіткі" вызначалі свой погляд на праблему так: "Кожнаму сваё: хай палітыкі грызуцца і дзеляцца. Пісьменнікі і масткакі, наагул культурнікі – належаць не партыі, а ўсей Нацыі" [3, с. 2]. Таму ў заходнебеларускіх літаратурных часопісах рэгулярна друкаваліся творы Я. Коласа, Я. Купалы, Ц. Гартнага, У. Жылкі, У. Дубоўкі, Я. Пушчы, М. Лынькова. У 1936 г. рэдакцыя "Калосься" выдала дадатковую кніжку часопіса, цалкам прысвечаную творчасці Я. Коласа з нагоды трыццатых угодак яго творчай дзейнасці. У часопісах "Родныя гоні", "Нёман", "Крыгалом", "Літэратурная старонка" і "Калосьсе" асвятлялася літаратурна-мастацкае жыццё ў БССР, дасягненні беларускай савецкай культуры.

Аднак палітычнае і ідэйнае супрацьстаянне ў заходнебеларускім грамадстве не абмінула і літаратурныя часопісы. Найбольш дакладна ідэалагічная пазіцыя была вызначана ў часопісе "Крыгалом"; выдаўцы адкрыта пісалі: "…мы знаем толькі клясавую творчасць" [15, с. 1]. Падбор матэрыялаў у часопісе таксама яскрава сведчыў аб яго камуністычнай скіраванасці. Падобнай пазіцыі прытрымлівалася і рэдакцыя "Літэратурнай старонкі", не робячы аднак выразна рэвалюцыйных заклікаў. Прасавецкай скіраванасць часопіса распазнаецца па варожым стаўленні ў дачыненні да беларускіх дэмакратычных партый і арганізацый: Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД),



Полесгу

БІГіК, Беларускага сялянскага саюзу [17, с. 10]. У астатніх часопісах ідэалагічны накірунак вызначаўся праз крытычныя допісы і паленіку з іншымі выданнямі. Так, у "Родных гонях" жорсткай крытыцы падвяргалася газета "Беларуская крыніца" (орган БХД), газета "Беларускі дзень" і часопіс "Беларуская культура" абвінавачваліся ў прапольскай скіраванасці [1, с. 15]. У сваю чаргу выдаўцы "Беларускай культуры" адмоўна выказваліся аб газетах "Сялянская ніва" (друкаваны орган Беларускага сялянскага саюза), "Наша праўда" (выданне, звязанае з дзейнасцю БСРГ) і "Беларускае слова" (выданне Беларускай нацыянальнай рады) [2, с. 41], [24, с. 125]. Выдаўцы часопіса "Новая варта" абвінавачвалі аўтараў газеты "Беларуская крыніца" (друкаванага органа БХД) у прадузятым стаўленні да іх выдання, і ўвогуле крытыкавалі дзейнасць БХД. Пры гэтым так жа крытычна яны выказваліся і аб камуністычных дзеячах, падавалі рэзка адмоўную ацэнку дзяржаўнай палітыкі БССР у дачыненні да нацыянальнай культуры і яе дзеячоў [6, С. 3–5].

Відавочна, што асобныя заходнебеларускія дзеячы добра разумелі наступствы няспыннай палітычнай канфрантацыі ў беларускім грамадстве. Так, рэдакцыя часопіса "Досьвіткі" слушна заяўляла: "Гэтыя жа палітычныя мэты разьбілі агульны нацыянальны фронт і дзякуючы гэтаму зрабілі немагчымым наладжаньне культурнай працы ў шырокім маштабе" [3, с. 1]. Аднак заклікі да яднання, якія гучалі са старонак часопісаў, былі не ў стане кардынальна паўплываць на сітуацыю, якая скалалася ў грамадстве Заходняй Беларусі. Нават часопіс "Калосьсе", які сумеў аб'яднаць усе плыні заходнебеларускай літаратуры, не быў вольны ад палітычных тэм, хоць і імкнуўся падаваць карціну беларускай культуры выключна з боку поспехаў у яе развіцці. Сапраўды, раздзел "Хроніка" у часопісе адсочваў толькі станоўчыя падзеі ў нацыянальна-культурным жыцці савецкай Беларусі, аднак адначасова ў "Калосьсі" друкаваліся артыкулы, у якіх становішча беларускай культуры ў БССР ацэньвалася вельмі адмоўна [8, С. 178–183]. Такая няспынная ідэалагічная барацьба на старонках літаратурных часопісаў безумоўна супярэчыла заклікам да апалітычнасці і аб'яднання дзеля культурнай працы, з якімі іх рэдактары і аўтары звярталіся да чытачоў, і не спрыяла выпрацоўцы адзінай стратэгіі нацыянальнай культуры.

Акрамя менавіта мастацкіх твораў і іх крытыкі літаратурныя часопісы друкавалі разнастайныя навуковыя працы: гістарычныя, мовазнаўчыя, сацыялагічныя і этналагічныя. Паколькі выданне асобнай манаграфіі ці зборніка артыкулаў рэдка было даступным для заходнебеларускіх навукоўцаў, галоўнай пляцоўкай для развіцця навуковых даследаванняў сталі менавіта перыядычныя выданні, у тым ліку і літаратурныя. Выдаўцы таксама добра ўсведамлялі асветную функцыю такіх публікацый. У першай кніжцы "Родных гоняў" ананімны аўтар пісаў аб важнасці літаратурнага часопіса менавіта з пункту гледжання адукацыі: "Беларускі народ, як народ бедны, ня мае шырокай магчымасьці здабываць навуку ў унівэрсітэтах… але затое беларуская працоўная інтэлігенцыя можа даць асьвету тысячам самавукаў" [1, с. 16]. Найвялікшая ўвага ў літаратурных часопісах надавалася айчыннай гісторыі. Напрыклад, "Родныя гоні" надрукавалі матэрыялы па гісторыі рэфармацыі на Беларусі [18, С. 28–42], аграрнаму становішчу беларускіх земляў у XIX ст. [12, С. 33–41]; "Нёман" размясціў вялікую працу па гісторыі копных судоў у Беларусі [21]; у "Беларускай культуры" быў прадстаўлены агляд гісторыі ўніяцтва ў Беларусі [11, С. 42–55]; у "Новай варце" быў надрукаваны артыкул, прысвечаны Льву Сапегу [22, С. 5–10], [23, С. 4–6]. Значная колькасць гістарычных даследаванняў А. Станкевіча, А. Клімовіча, М. Шкялёнка, А. Саладуха, М. Пецюкевіча публікавалася ў часопісе "Калосься", таксама як і асобныя вытрымкі з гістарычных прац, выдадзеных у БССР.

Яшчэ адной сталай тэмай у заходнебеларускіх літаратурных часопісах была беларуская філалогія. На старонках "Нёмана" разгарнулася дыскусія аб беларускім правапісу паміж А. Луцкевічам і заходнебеларускім мовазнаўцам Я. Станкевічам [19, С. 77–80], [20, С. 134–142]. Гэты ж навуковец прадставіў шэраг даследаванняў беларускай мовы і яе гістарычнага развіцця ў часопісах "Родныя гоні" і "Калосьсе". У гэтых жа



Полесгу

часопісах былі размешчаны філалагічны допісы А. Станкевіча, У. Чэмера, М. Пецюкевіча, І. Вайцяховіча. У літаратурных часопісах сустракаліся і такія асветныя матэрыялы, якія не мелі прамога дачынення да літаратуры і мастацтва. Так напрыклад, “Родныя гоні” знаёмілі чытачоў з навуковай дзейнасцю Ісаака Ньютана [14, С. 20–26] і Бенедыкта Спінозы [7, С. 28–33], а “Новая варта” асвятляла пытанне спорту ў Заходняй Беларусі [16, С. 19–22].

Такім чынам, нягледзячы на складаныя ўмовы выхаду і абмеважанасць магчымасцяў, беларускамоўныя літаратурныя часопісы Заходняй Беларусі мелі дакладна акрэслены ўплыў на грамадства. Сама іх наяўнасць сцвярджала сталасць культурнага развіцця нацыі, дапамагала падтрымліваць еднасць беларускай нацыі праз еднасць яе літаратуры. Мастацкія і навуковыя літаратурныя выданні ўмацоўвалі нацыянальную свядомасць, развівалі цікавасць да роднай культуры; на іх старонках друкаваліся гістарычныя, мовазнаўчыя, этналагічныя даследаванні, што спрыяла развіццю беларускай навукі. Таксама гэтыя выданні з’уляліся пляцоўкай не толькі для літаратурных, але і грамадска-палітычных дыскусій: з аднаго боку, яны служылі адным з інструментаў палітычнай прапаганды, але ў той жа час прадстаўлялі магчымасць пераадолення ідэйных разыходжанняў дзеля адзінай задачы захавання і развіцця нацыянальнай культуры.


1. Аб культурнай працы // Родныя гоні. –1927. – Кніжка 1. – С. 15-16.
2. Ад “Нашае Долі” да “Беларускае Культуры” // Беларуская культура. – 1927. – Кніжка 1. – С. 40–41.
3. Ад рэдакцыі // Досьсвіткі. –1927. – № 1. – С. 1–2.
4. Ад рэдакцыі // Калосьсе. – 1935. – Кніжка 1. – С. 1–2.
5. Ад рэдакцыі // Прамень. – 1926. – № 1. – С. 1–3.
6. Барацьба з інтэлектам // Новая варта. – 1934. – № 3. – С. 3–5.
7. Барух Сьпіноза // Родный гоні. – 1927. – Кніжка 3. – С. 28–33.
8. Бужанскі, А. У абліччы расейскага тэрмідору / А. Бужанскі // Калосьсе. – 1938. – Кніжка 3. – С. 178–183.
9. Говін, С. В. Друк Заходняй Беларусі / С. В. Говін. – Мінск : Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1974. – 95 с.
10. Заходняя Беларусь: зборнік грамадзкае мысьлі, навукі, літэратуры, мастацтва Зах. Беларусі / Беларускае выдавецкае таварыства. – Вільня, 1924. – 155 с.
11. Зенюк, Я. Аб Уніі на беларускіх землях / Я. Зенюк // Беларуская культура. – № 1. – С. 42–55.
12. Зянюк, А. Зямельныя адносіны ў Беларусі і аграрная палітыка канца XIX стагодзьдзя / А. Зянюк // Родныя гоні. – 1927. – Кніжка 1. – С. 33–41.
13. Луцкевіч, А. Наш культурны стан / А. Луцкевіч // Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / А. Луцкевіч. – Мінск : “Кнігазбор”, 2006. – 459 с.
14. Найвялікшы геній “матэматычнага веку” – Ісаак Ньютон // Родныя гоні. – 1927. – Кніжка 4. – С. 20–26.
15. Наш “Крыгалом” // Крыгалом. – 1935. – № 1. – С. 1–2.
16. Наш спорт // Новая варта. – 1932. – № 2. – С. 19–22.
17. Руніч, М. На новым этапе / М. Руніч // Літэратурная старонка. – 1934. – № 1. – С. 9–10.
18. Савіч, А. Беларускія школы ў старой Вільні / А. Савіч // Родныя гоні. – 1927. – Кніжка 6. – С. 28–42.
19. Станкевіч, Я. Дзеля абароны беларускага языка / Я. Станкевіч // Нёман. – 1932. – Кніжка 2. – С. 77–80.
20. Станкевіч, Я. Адказ маім “крытыкам” / Я. Станкевіч // Нёман. – 1932. – Кніжка 4. – С. 134-–142.
21. Шкялёнак, М. Копныя суды ў Беларусі / М. Шкялёнак // Нёман. – 1932. – Кніжка 3. – С. 101–106; – Кніжка 4. – С. 128–133; – Кніжка 5. – С. 179–184.
22. Шклялёнак, М. Леў Сапега – вялікі канцлер літоўскі / М. Шкялёнак // Новая варта. – 1931. – № 1. – С. 5–10.


Полесгу

ПолесГУ

23. Шклялёнак, М. Леў Сапега – вялікі канцлер літоўскі / М. Шкялёнак // Новая варта. – 1932. – № 2. – С. 4–6.
24. Як спаткалі № 1 “Беларускае Культуры” // Беларуская культура. – 1927. – Кніжка 2-–3. – С. 124–125.
25. Kurowski, T. Some Notes on the History of Literary Magazines / T. Kurowski // Mississippi Review. – 2008. – Vol. 36. – № 3. – P. 231-–243.
26. Traczuk, J. Czasopiśmiennictwo białoruskie w II Rzeczypospolitej (1918—1939) / J. Traczuk. – Siedlce: Wydawnictwo Uniwersytetu Przyrodniczo-Humanistycznego w Siedlcach, 2013. – 270 s.